## Анатоль КОЗІЧ

* * *

Лёс умывае вадою з лужыны.
Часам цяжка не пагадзіцца.
Ці памыты, а ці прастуджаны?
А прымусіць можа й напіцца.

Лёс заганяе на плот павалены,
Ад сабак ці варон бараніцца.
Не мінуе мастоў падпаленых.
А прымусіць можа й скарыцца.

Лес пачастуе скарынкай чорстваю,
Нават часу не дасць маліцца.
Не пярынай, а полем з жорстваю
Застаецца ўсім хваліцца.

Лёс, да нягоды з парою шчодраю.
Ну не з Богам ж ісці і сварыцца...
Накрываюць нябёсы коўдраю.
Мо з вясною ўсё праясніцца.